Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

5-га СНЕЖНЯ — ДЗЕНЬ САВЕЦКАЙ КАНСТЫТУЦЫІ

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 36 (648) Пятніца, 2 снежня 1966 года Год выдання XX. Цана 2 кап.



*Сесія... Яна вось-вось прыдзе і на падрыхтоўчы факультэт нашага універсітэта. Выкладчык А. Н. Сманцэр тлумачыць замежным навучэнцам складаныя задачы па матэматыцы.*

*Фота А. Кадзета.*

## СТВАРАЛЬНІКІ СВАЙГО ШЧАСЦЯ

Штогод 5-га снежня калектыў нашага універсітэта, як сваё асабістае свята, адзначае Дзень Савецкай Канстытуцыі, які з'яўляецца сведкай велічных пераўтварэнняў, што адбываюцца ў эканоміцы, навуцы і культуры, дабрабыце народа. Разам з тым ён сам сведчыць аб невычарпальных магчымасцях сацыялістычнай дэмакратыі, аб паўсядзённым клопаце партыі і Савецкай улады аб росквіце матэрыяльных і духоўных сіл усіх працоўных, развіцці талентаў, якімі так багата наша краіна.

Толькі за пасляваенныя гады Беларускі дзяржаўны універсітэт імя Ул. І. Леніна закончылі тысячы юнакоў і дзяўчат. Яны плённа працуюць у розных галінах гаспадаркі, навуковых установах, савецкіх і партыйных органах, у школах. Яны высока трымаюць гонар сваёй альма-матэр, заўсёды памятаюць, што сваім асабістым шчасцем, магчымасцю працаваць на карысць Радзімы абавязаны ленінскай партыі, Савецкай уладзе. Радасна адзначыць, што ўжо нядаўнія выпускнікі універсітэта за свае поспехі ў рабоце адзначаны высокімі ўзнагародамі. Так, напрыклад, выпускніца 1962 года Ванда Тамковіч, якая працуе ў Клецкім раёне Мінскай вобласці, удастоена ордэна Леніна.

З кожным годам універсітэт усё лепш і лепш забяспечваецца навуковым абсталяваннем, тут ствараюцца усе неабходныя ўмовы для паспяховай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў. Нельга не адзначыць таксама, што наш універсітэт з'яўляецца яскравым прыкладам трыумфа ленінскай нацыянальнай палітыкі. дружбы народаў і здзяйснення на практыцы прынцыпаў інтэрнацыяналізму.

Няхай квітнее і развіваецца савецкая сацыялістычная дэмакратыя!

## НА ПАРАДКУ ДНЯ — ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ

*Адбылася справаздачна-выбарчая канферэнцыя ДТСААФ універсітэта. Дакладчык—старшыня камітэта М. Я. Бондар—і выступіўшыя ў спрэчках адзначылі, што калектыў ДТСААФ, ідучы насустрач 50-годдзю Савецкай улады, дабіўся добрых вынікаў у рабоце. Яго роля ў патрыятычным выхаванні студэнтаў усё больш і больш узрастае. Вызначыўшы задачы на будучы год, канферэнцыя абрала новы састаў камітэта і рэвізійную камісію. Старшыня камітэта ДТСААФ М. Я. Бондар, старшыня рэвізійнай камісіі Г. М. Якубоўская. Матэрыял аб рабоце канферэнцыі будзе надрукаваны ў наступных нумарах нашай газеты.*

## МЫ ВУЧЫМСЯ...

Фізікі на лекцыі. На 2—3 старонках — нашы студэнты на Енісеі. Фота А. Кадзета.



## ЗАПАЛЕНЫ КАСТРЫЧНІКАМ

Учора ўсё прагрэсіўнае чалавецтва адзначыла Дзень Афрыкі. А менш чым праз два тыдні мой кенійскі народ будзе адзначаць Дзень незалежнасці сваёй краіны—вялікае нацыянальнае свята.

Сёння на афрыканскім кантыненце ўжо большасць краін дабілася свабоды і незалежнасці. Гэтыя заваёвы атрыманы ў працяглай і цяжкай барацьбе шматпакутных каланіяльных народаў. На рашучую барацьбу з каланізатарамі іх падняў і натхніў вялікі прыклад рускага рабочага класа і сялянства, якія здзейснілі Вялікую Кастрычніцкую сацыялістычную рэвалюцыю.

Як ні стараліся каланізатары захаваць ад нас кастрычніцкія падзеі 1917 года ў Расіі, аднак, як кажуць, шыла ў мяшку нельга ўтаіць. Аб велічнай перамозе рускіх рабочых дазналіся ўсе і ўсюды.

«Камуністычная літаратура» ў Афрыцы была забаронена каланіяльным законам, за парушэнне якога адпраўлялі ў турму ці штрафавалі. А прыгнечаны чалавек ведаў, што такое каланіяльная турма. І ўсё ж з кожным днём станавілася ўсё больш і больш змагароў за свабоду, за ліквідацыю дыскрымінацыі і эксплуатацыі чалавека чалавекам.

У Кеніі імя нацыянальнага героя Дзедана Кімаці не зыходзіць з вуснаў працоўных. Ён загінуў як бясстрашны змагар за свабоду свайго народа. Яго подзвігі жывуць у сэрцах кенійцаў, як полымя вечнага агню, як вечнае сонца, якое дае нам цяпло. Дзедана Кімаці ведаў аб звяржэнні англійскага каланіяльнага рэжыму ў Егіпце, ведаў аб Савецкім Саюзе, аб рускіх рэвалюцыянерах. І калі было цяжка і людзі падалі духам, ён расказваў ім, што дзесьці далёка на поўначы простыя людзі згуртаваліся і скінулі стары ненавісны лад, самі пачалі кіраваць краінай, імя яе — СССР. Ён расказваў, што гэтай барацьбой у далёкай краіне на поўначы кіраваў чалавек, якога звалі Ленін.

Менавіта аб гэтым ён заявіў аднойчы на мітынгу:

— Далёка-далёка ад экватара, на поўначы ёсць адна краіна, у якой народ пазбавіўся ад свайго цара. Народам кіраваў адзін вельмі разумны чалавек — Ленін. Ён стварыў свабодную дзяржаву — Савецкую Расію, якой кіруюць самыя сумленныя старэйшыны — Саветы. Хіба не можам мы — усе сто плямён Кеніі — аб'яднацца і вызваліць сваю краіну?!

— Можам! — усклікнулі байцы за свабоду. — Паклянемся, што не будзем ведаць страху і стомы, пакуль не заваюем свабоду, як Расія.

Усе прысягнулі змагацца да апошняга дыхання. І яны стрымалі гэтае слова. Кенія стала свабоднай.

49 гадоў прайшло з той пары, як народ Расіі пад кіраўніцтвам партыі і Вялікага Леніна запаліў факел свабоды і справядлівасці і высока падняў яго над сусветам. Гэты непагасны факел сёння асвятляе ўсім прыгнечаным народам шлях да новага жыцця, акрыляе ўсіх прыгнечаных надзеяй і верай у светлае будучае.

І няхай ніколі не гасне гэты велічны факел, запалены Вялікім Кастрычнікам, як легендарны сімвал свабоды, справядлівасці і міру на зямлі. Няхай свеціць ён усім афрыканскім народам на шляху да новага жыцця!

**Роберт КЕЙГЕ,**
**студэнт другога курса біялагічнага факультэта.**

## БУДЗЕМ ЗАЎЖДЫ СЯБРАВАЦЬ

У адным пакоі са мной жывуць Джон Флетчар з Ганы, Хезрон Нʼяндыка з Кеніі і Гена Ярош. Пакой наш інтэрнацыянальны і дружны. Па спецыяльнасці ён дзеліцца на два «лагеры», якія часта спрачаюцца і нават «сварацца». Справа ў тым, што Джон і Гена — фізікі, а я і Хезрон — біёлагі. На гэтай аснове і ўзнікаюць часта дыскусіі. Фізікі спрабуюць паказаць сваю перавагу, а мы не здаемся і запэўніваем, што біялогія таксама не «апошняя скрыпка» у вялізным аркестры навук, што з кожным годам яе роля будзе ўсё ўзрастаць.

І ўсё ж мы жывём дружна. У вольны час разам гуляем па горадзе, ходзім у кіно, на вечары. Многа дапамагаем адзін аднаму і ў вучобе. Часта мы з прыемнасцю ўспамінаем свае школьныя гады, родныя мясціны: Джон і Хезрон расказваюць аб Афрыцы, а мы — аб Беларусі. У гэтых гутарках пазнаеш многа новага і цікавага аб далёкім кантыненце і гэта дапамагае глыбей зразумець тыя ўнутраныя працэсы, якія цяпер адбываюцца на афрыканскай зямлі. І яшчэ нас радуе, што наша дружба мацнее з кожным днём. Мы будзем сябраваць заўсёды.

**Адам ГРАДАЎ,**
**студэнт біяфака.**

Усебаковае развіццё і ўдасканаленне сацыялістычнай дэмакратыі, актыўны ўдзел усіх грамадзян у кіраўніцтве дзяржавай, у кіраўніцтве гаспадарчым і культурным будаўніцтвам, паляпшэнне работы дзяржаўнага апарата і ўзмацненне кантролю над яго дзейнасцю — такое галоўнае накіраванне развіцця сацыялістычнай дзяржаўнасці ў перыяд будаўніцтва камунізма.

(З Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза).

# Літаратурная старонка

ШТОМЕСЯЧНЫ ВЫПУСК

Алесь РАЗАНАЎ

## МАРАТУ КАЗЕЮ

Калі я траплю ў акружэнне
Варожых твараў і вачэй,
Калі туга,
як паражэнне,
Балюча сэрца апячэ,
З зямлі,
любімай і пакутнай,
З-за купкі тоненькіх бяроз,
Непадуладны,
Ўсемагутны,
Я уздымуся ў поўны рост.
Ступлю
сцяжынкаю карнатай
Насустрач будучай вясне.
І сэрца выбухам гранаты
Пануры дол
устрасяне.

## Мова

Празрысты звон,
Грымотны грукат,
Скалісты свіст,
Магутны гул —
Усе
разрозненыя гукі
Цяклі,
Каб зліцца
у агул,
Хісталі
ўздыбленыя далі,
Глыбаста білі ў небасхіл.
І ў немату
не прападалі,
А западалі
І раслі.

І ціш і гром,
І звон і шорах
Спляліся
ніткаю радства,
Калі з грудзей,
нямых і хворых,
Аднойчы
мова прарасла.

Лена РУЦКАЯ

## Ранак

Узнялося сонца на золаку,
Абапёршыся хвоям на плечы,
Нібы хто адчыніў заслонку
Ад развогненай рускай печы.

Дрэвы ў лісці — далоні ловяць
Тых праменняў цяпло жывое,
І заслала азёрную роўнядзь
Сонца сцежкаю залатою.

І расплюшчваюць кветкі вочы,
Зіхацяць павуцінкі-кросны.
«Добры дзень, табе, — ветрык
шапоча, —
Беларускі ранак мой росны».

Яўгення ЯНІШЧЫЦ

## ПАДХАПІЛІ МЯНЕ ВЕТРЫ

Падхапілі мяне ветры
І панеслі сінюткім вераснем.
І жыву я паміж вітрын,
У ружовы ранак паверыўшы.
Застануся, як неба стынь,
Самай светлай і самай шчырай,
Буду слаць да цябе лісты
Кожным ранкам нібыта з выраю.

Сяргей ЗАКОННІКАЎ

## СЛОВА ДА ЗЯМЛІ

**Мо ўспамінаем аб табе мы рэдка,**
**Ды кожным нервам звязаны навек.**
**Жыве, жыве зямля — нямая**
**сведка—**
**Тваіх шляхоў і славы, чалавек.**
**Падзякі нават кропелькі**
**не просіць,**

**Нібы глядзіць на ўсіх і ўсё здаля,**
**Як шар більярдны, круглая**
**і простая**
**І, як сусвет, складаная зямля.**
**Цябе мы беражэм і ўшаноўваем,**
**Табой, нібы матуляй, даражым,**
**Ды ворагі нясуць пакуты новыя —**
**Мерыдыянам кожным ты дрыжыш.**
**Зямля, зямля — маё выратаванне.**

**Не дам я, каб цябе трывожыў**
**боль.**
**І слаўлю я найлепшае**
**з спатканняў —**
**Спатканне векавечнае з табой!**

* * *

**Навальніца хоча неба запаліць,**
**Гронкамі маланак пагражае.**
**Стрэламі зялёнымі з раллі**
**Рвуцца аж да хмараў ураджаі.**
**Нібы чаркі—спорны, цёплы дождж**
**Каліўцы вадой крыштальнай**
**поўніць.**
**І хмялее сілай маладой,**
**Перуном разбуджанае поле.**
**Пройдзе час і калассы сама**
**На далонь мне пакладзе пшаніца.**
**Буду беражна ў руках трымаць**
**Майскія дажджы і навальніцы.**

*Аддзелам кіруе дацэнт кафедры беларускай літаратуры паэт Алег Лойка*

Мар'ян ДУКСА

## ПАХНЕ ЖЫВІЦАЙ

Пахне жывіцай,
свежай жывіцай!
Той,
Што поўняцца нашы лясы.
Пацеркай золкай
на позніх брусніцах
Вісне празрыстая кропля расы.
Пахне жывіцай.
Цудна і ціха.
Белы туман сярод сосная брыдзе.
Вечар сухі перад сном
пакалыхвае,
Ды выпадковая шышка спадзе.
Гнуцца сцяжынкі,
як тонкія дужкі —
Дай пагадаю,
якою ісці.
Лісце — нібы пералётныя птушкі—
Жоўтым крылом
нада мной шалясціць.
Пахне жывіцай хвоя старая,
Водар у грудзі сцякае густы.
Трачу прытомнасць!
Зноў ажываю.
Пахне жывіца — лясны нашатыр.

Юрка ГОЛУБ

## Нераст

Нераст, нераст!..
Выбухі, як біўні!
Па панурых тонях рэха,
нібы стогн!
Пацягнуўся ў акрыялы верас
Дзень, як цень аглухлы,
на пастой.

Нераст, нераст!
Ноччу паўнаводнай
Па рацэ ільдзінкамі плыла
луска.
Мяне будзілі сны, як бракан'еры,
Што краліся да берага
з ляска.

Нераст, нераст!
Закіпаюць воды!
І заціх, як выдра, стоены
абрыў...
Тол не узарвецца—разарвецца
нерат!
Вырасце малеча.
А пакуль —
мядовы месяц рыб!..

## КАЛІ ХВАЛЮЕ ЛЁС ГЕРОЯЎ...

*Амаль два тыдні ў студэнцкай чытальнай зале вісела аб'ява аб дыспуце па аповесці С. Антонава «Разарваны рубель». І вось надышоў вызначаны час. У зал збіраюцца тыя, хто любіць літаратуру. Каля акна стаяць энтузіясты, якім не цярпелася хутчэй выказаць свае думкі.*

*Пачаўся дыспут неяк вяла, без агеньку. У першых выступленнях адчуваецца нейкая стрыманасць. Многія чамусьці гавораць толькі аб недахопах твора. Але вось узнікае пытанне: чаму усё ж аповесць называецца «Разарваны рубель»? Цяпер ужо — непадкупная зацікаўленасць, аб лёсе герояў. Усім хочацца выказаць свае меркаванні, даць ацэнку таму ці іншаму вобразу, эпізоду. Нават тыя, хто хацеў быць толькі назіральнікам, уцягваюцца ў гарачую палеміку. Часамі гул задавальнення ці абурэння спыняе выступаючага. Хвалюе лёс Грушы і Пастухова. Хвалюе пытанне: што ж хацеў выказаць аўтар у канцы аповесці? Дыспут разгараецца. Ідзе шчырая, карысная размова.*

*Радуе тое, што ў ім ўдзельнічалі прадстаўнікі амаль усіх факультэтаў: хімікі, матэматыкі, філолагі. Сказалі сваё слова і будучыя біелагі і фізікі.*

## ДВАНАЦЦАЦЬ ВЯНКОЎ ПАЭТУ



**У нашай савецкай літаратуры пра Максіма Багдановіча, чалавека з вельмі складаным і шматгранным унутраным светам, напісаны ўжо цэлы шэраг матэрыялаў. Але даследаванне дацэнта кафедры беларускай літаратуры А. А. Лойкі «Максім Багдановіч», якое сёлета вышла з друку, мы, студэнты, чытаем з вялікім захапленнем.**

**У першым раздзеле кнігі аўтар вядзе пранікнёную і шчырую гаворку з чытачом аб любві выдатнага майстра беларускай паэзіі да свайго народа, аб яго нянавісці да прыгнятальнікаў. Алегу Антонавічу ўдалося цікава і падрабязна расказаць пра дзяцінства паэта, пра яго нязвычайную дапытлівасць і назіральнасць да ўсяго акружаючага. Па-майстэрску тут выкарыстана шмат трапных дэталей з жыцця паэта, рыс яго характару і таму перад намі дзяцінства Максіма Багдановіча паўстае, як вельмі рэалістычная карціна.**

**«Падзеі і ўражанні рабілі яго беларускім песняром, — чытаем у раздзеле, — непарыўна былі звязаны з паглыбленнем ў сусветную класіку, якую рэкамендаваў яму спачатку бацька». У свае дзевятнаццаць год Максім — ужо сталы паэт, патрыёт свайго роднага краю. Нягледзячы на тое, што ён жыве каля прыгажуні Волгі, якая апета ў цудоўных творах, нягледзячы на тое, што ён любіць неабсяжныя волжскія прасторы, Багдановіч часта думае аб роднай Беларусі. Ён піша аб светлым Нёмане, аб прыгожых беларускіх лясах, аб вузкіх сялянскіх палосках, што прарэзалі балоты, пералескі.**

**Чаму так сталася, што, жывучы ў Ніжнім Ноўгарадзе, у Яраслаўі і маючы пад рукой толькі слоўнік Насовіча, Максім Багдановіч так па-майстэрску піша беларускія вершы! Чаму яго імя пастаўлена літаратуразнаўцамі і крытыкамі побач з прозвішчамі Янкі Купалы і Якуба Коласа! На гэтыя і многія іншыя пытанні даследчык дае глыбокія і змястоўныя адказы.**

**Я не пішу рэцэнзію на манаграфію. Мне толькі хочацца выказаць шэраг заўваг аб тым, чаму кніга Алега Антонавіча Лойкі так спадабалася студэнтам, чым яна карысна для філолагаў. Каштоўна тое, што аўтар уважліва і своеасабліва падыходзіць да аналізу паэтычнага майстэрства Максіма Багдановіча. На аснове пераканаўчых прыкладаў ён характарызуе важнейшыя рысы творчасці паэта і правільна прыкмячае, што «драматызм— увогуле адна са скразных асноў паэзіі Багдановіча».**

**Асабіста для нас, філолагаў, на маю думку, вельмі карыснымі ў манаграфіі з'яўляюцца раздзелы пад назвай «Жнучы ўраджай стагоддзяў» і «Пошукі эпасу». Яны цесна звязаны паміж сабой. У першым пераканаўча падкрэсліваецца шырыня эрудыцыі і вастрыня ўдумлівасці Максіма Багдановіча ў пошуках арыгінальнага беларускага складу верша. У другім—завострана ўвага на пошуках і набліжэнні да эпасу ў творчасці паэта. Дзякуючы гэтым намаганням, па меркаванню аўтара манаграфіі, з'явіліся на свет такія арыгінальныя, «чыста» беларускія вершы, як «Слуцкія ткачыхі», «Зорка Вянера ўзышла над зямлёю», «Маладыя гады» і іншыя.**

**«У творчасці яго раптоўнага няма» — так называецца сёмы раздзел кнігі, які можна назваць важнейшым і лепшым. Паказваючы метафарызацыю, шматколернасць эпітэтаў, музыкальнасць і мудрасць кожнага вобраза, Алег Антонавіч глыбока раскрывае паэтыку Максіма Багдановіча. Кніга А. А. Лойкі — гэта не толькі карысны дапаможнік для студэнтаў-філолагаў, але і цікавы расказ для шырокага чытача. Кожны раздзел кнігі—гэта вянок вялікаму беларускаму паэту.**

**М. ВАЎРУК,**
**студэнт чацвертага курса аддзялення журналістыкі.**

Рэдактар М. І. ІОСЬКА

АТ 02748 Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 108, тэл. 2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 1578